сюджаным варыянце мела форму кадушкі на 3 ножках, якія ўтваралі падоўжаныя клёпкі. Бялізну складвалі ў Ж., перасыпаючы па слаях попелам (найб. эфектыўным лічыўся попел бярозавых дроў), залівалі кіпенем або шчолачным растворам. У такім стане бялізна парылася і «адыходзіла ад бруду». Праз некалькі гадзін ваду злівалі праз адтуліну ў днішчы ў падстаўленае карыта, а бялізну мылі ў балеі ці ночвах. У летні сезон бялізну пасля Ж. складвалі ў кош ці грузілі на каромысел і неслі на рэчку (да вадаёма), дзе звычайна на беразе былі ўладкаваны спец. масткі. Тут бялізну паласкалі і адбівалі пранікамі. Больш архаічны тып Ж. ўяўляў сабой *кадаўб* — часта без днішча, у яго складвалі забруджаную бялізну. Кадаўб ставілі ў цэбар ці балею і палівалі шчолачным кіпенем. Апошні адыгрываў ролю мыльных сродкаў. У нар. практыцы Ж. сустракаліся да сярэдзіны 20 ст. *В.С.Цітоў.*

**«ЖМУ́РКІ»**, беларуская народная гульня дзяцей і падлеткаў. Гуляюць у хаце, на вуліцы, у полі, лесе, дзяўчынкі і хлопчыкі разам і паасобку, незалежна ад колькасці. Пашырана ў Беларусі ў шэрагу разнавіднасцей (простых і з элементамі тэатралізацыі). Варыянты назваў: «Хаванкі», «Праткі», «Сляпак», «Плюшч», «Сляпа курыца», «Кот», «Палачка-шукалачка», «Дуб», «Апанас», «Ермала», «Яша» і інш. Пры дапамозе лічылкі ці палачкі (чыя рука акажацца зверху) вызначаюць каму «жмурыцца». Дзіця, якое жмурыцца, заплюшчвае вочы і закрывае іх далонямі, затым пачынае гучна лічыць (лік вызначаецца загадзя), накшталт «1, 2, 3, 4, 5 — я іду шукаць». Гульцы разбягаюцца і хаваюцца, пачынаецца шуканне. Адшуканага гульца трэба застукаць. «Жмурачы» («жмур», «жмурка», «жмурак») бяжыць да месца, адкуль пачалася гульня, і стукае па лавачцы (калодачцы, дошчачцы ці інш. прадмеце) і выгуквае: «Стук, стук, я застукаў...» і называе імя дзіцяці. І гэтак кожнага. Здаралася так, што «застукваў сябе гулец, які хаваўся». Калі знаходзілі ўсіх, гульня пачыналася спачатку. «Жмурыў» той, хто быў першы застуканы. Калі гуляюць на абмежаванай прасторы, аднаму з гульцоў завязваюць вочы, і ён ловіць астатніх. У гэты час дзеці з розных бакоў адвольна выгукваюць: «Ко-ко-ко...». У гульні карагоднага тыпу хлопчыкі і дзяўчынкі выбіраюць «Яшу». Завязаўшы яму вочы, ставяць на сярэдзіну кола. Узяўшыся за рукі, ходзяць вакол Яшы і спяваюць: «Сядзіць, сядзіць Яша // Пад арэхавым кусточкам.// Грызе, грызе Яша // Арэшкі зялёныя». «Яша» ходзіць у сярэдзіне кола. Пасля апошніх слоў песні карагод спыняецца. «Яша», узяўшы бліжэйшага гульца за руку, павінен назваць яго імя. Калі адгадвае, мяняецца з ім ролямі. Гульня пачынаецца спачатку. У гульні дыялогавага тыпу гульцу («Ермале») завязваюць хусцінкай вочы, выводзяць яго за дзверы. Праз шчылінку задаюць яму розныя пытанні. Пасля апошніх слоў («...лаві нас!») гулец заходзіць у пакой і з завязанымі вачыма ловіць сваіх сяброў, якія перыядычна у розных баках пляскаюць у ладкі.

*Літ.*: Гл да арт. *«Жгуцікі».*

*М.А.Козенка.*

**ЖНІЎНЫЯ АБРА́ДЫ**, шэраг рытуалаў, які пачынаўся з агледзін жытняга поля і заканчваўся спажываннем адпаведных страў. Найб. дакладна яны выяўляюцца ў абрадавых комплексах: *Пакрыванне поля*, *Зажынкі* і *Дажынкі.* Агледзіны нівы ажыццяўляў сам гаспадар. Ён, абыходзячы поле, спрабаваў на смак у розных месцах зярняты і вырашаў, у які дзень пачынаць Зажынкі. Ім папярэднічаў абрад Пакрывання поля, які выконваў функцыю яго «апладнення» («Пашлі, Божа, многа збожжа, крыта, поле, крыта!»). Рытуальныя дзеі абраду Зажынак разгортваліся вакол першага снапа і мелі магічную накіраванасць у пажаданнях здароўя жнеям, добрага ўраджаю, спрыянню будучай плоднасці нівы. Асабліва ўшаноўваўся першы сноп: вакол яго вадзілі карагоды, ставілі на покуць, надавалі звышнатуральную ўласцівасць. Заканчваліся Зажынкі ўжываннем рытуальнай стравы і выкананнем зажынкавых песень. Завяршалі Ж.а. Дажынкі, у якіх наладжвалі стараж. абрад *Завівання барады*, аддаючы павагу казлападобнай істоце, што сімвалізавала Дух нівы, поля і, паводле нар. уяўленняў, спрыяла будучаму ўраджаю. Сплецены дажынкавы вянок уручалі гаспадару як сведчанне заканчэння цяжкай працы. У наш час узнаўленне Ж.а. магчыма толькі ў форме тэатралізаванага абрадавага прадстаўлення. Дакладнасць яго інтэрпрэтацыі залежыць ад ведання выканаўцамі і рэжысёрам вытокаў абрадава-святочнай культуры беларусаў. Сама інсцэніроўка матэрыялу можа з'яўляцца стылізацыяй, рэстаўрацыяй або рэканструкцыяй абраду.

*А.М.Аляховіч.*

**ЖНІЎНЫЯ ПАВЕ́Р'І І ЗВЫЧАІ**. Суправаджалі ўсе рытуальныя дзеі жніва (найб. адказнага перыяду ў жыцці земляроба), у якім адбіліся сляды анімістычных і магічных уяўленняў міфал. светапогляду на ўладкаванне прыроды і Сусвету. Ужо напярэдадні жніва вымывалі хату, засцілалі стол чыстым белым абрусам, выходзілі зажынаць у чыстым белым адзенні, што сведчыла аб асабліва адказным станаўленні да ўборкі збожжа. Небяспечным было для селяніна, калі пры агледзінах нівы ён знаходзіў каласы, звязаныя разам (закруцень), заламаныя (закручаныя) і пасохлыя ці абжатыя загоны. Па павер'ях сялян, гэта прадказвала гаспадару розныя няшчасці (смерць, паморак жывёлы). Лічылася, што закрутні робяць з праклёнам злыя суседзі, а абжынаюць загоны ведзьмы. Каб гэтага пазбегнуць, запрашалі знахароў або ў час красавання жыта асвячалі ніву. Магічную функцыю выконваў і абрад *Пакрывання поля.* У некаторых вёсках Беларусі жанчыны лічылі, што, перш чым рыхтавацца да зажынак, трэба «спа-

чатку ў Бога благаславіцца», інакш ён будзе караць градам і навальніцамі. Існавала прыкмета: якая з дзяўчат у час жніва далей з сярпом адыйдзе ад іншых, тая і хутчэй выйдзе замуж. У дажынкавым абрадзе адбіліся адгалоскі культу продкаў. Па вераваннях беларусаў, поспех у жніве ўвогуле залежаў ад апякунства нябожчыкаў. Напр., забаранялася жаць пасля заходу сонца, каб памерлыя бацькі «гулялі весела». Зажынкавы сноп называўся «дзед» і сімвалізаваў сабой апекуна збожжа, які меў сувязь з духамі продкаў. Рытуальная ежа на зямлі вакол «барады» таксама звязана з ушанаваннем памерлых. На зажынках, нажаўшы першы сноп, садзіліся есці кашу, бралі яе 3 разы ў рот, а тое, што заставалася, выкідвалі ў сноп. Густая каша выконвала сакральную функцыю: яна спрыяла ўрадлівасці зямлі і дабрабыту чалавека. Качанне і кулянне па зямлі рабілася дзеля добрага ўраджаю і дзеля таго, каб да дзяўчат, якія куляюцца, прыязджалі сваты. Эратычная функцыя «барады» вызначыла існаванне звязаных з ёю звычаяў і варожбаў. Так, апошнія каласы часам аздаблялі хмелем, што азначала эратычную сімволіку, клалі ў «бараду» хлеб-соль ці абкладвалі яе сярпамі і назіралі: калі мурашы ці казяўкі папаўзуць з «барады» — дзяўчына пойдзе замуж, а калі ў «бараду» — чакай нараджэння дзіцяці ці прыбытку. Варажылі і з сярпом, які кідалі пасля «завівання барады»: у які бок ён ляжа — чакай адтуль сватоў, а калі паляціць далёка — будуць сваты з далёкай вёскі. Ж.п. і з. праяўляюцца ў багатай семантыцы жніўнай абраднасці, у прыватнасці вянка, і перш за ўсё ў перанясенні самой назвы «вянок» на ўвесь абрад, які сімвалізуе новы ўраджай, багацце, плён, а часам замяшчае «апошні сноп» ці «бараду». Наогул магічная сімволіка вянка мае шматлікія адценні. Так, ён супастаўляецца з сонцам, уплывае на ўраджайнасць нівы, яго не выпадкова пляце прыгожая дзяўчына (удзельнікі абраду разумелі значэнне вянка як сімвала дзявоцкасці). У адпаведнасці з павер'ямі і звычаямі міфічны персанаж Раю, што сімвалізуе плённасць, запрашаюць за стол, за які «жнеечкі пазазаваны», «усе ў радочак Раю, мой Раю, пасаджаны». Ролю хлебароднага бажаства выконваў Спарыш, падвойны колас, які ўвасабляў «на таку ўмалот, а ў дзяжы падход, а ў печы рост, а на стале сыццё». У Ж.п. і з. ўвасобіліся быт. і сакральныя, рэальныя і міфічныя ўяўленні і вераванні селяніна-земляроба.

*Літ.*: Земляробчы каляндар: абрады і звычаі. Мінск, 1990; В а л о д з і н а Т. Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў. Мінск, 1997. *А.М.Аляхновіч.*

**ЖНІЎНЫЯ ПЕ́СНІ**, старажытны пласт летняга каляндарна-земляробчага фальклору беларусаў. З'яўляюцца вышэйшым дасягненнем традыц. песеннага мастацтва. Ж.п. ўключаюць 3 групы абрадавых песень: зажынкавыя («зажон»), жніўныя (працоўныя), дажынкавыя («дажон»). У дажынкавых песнях прасочваецца клопат жняі аб добрым для працы надвор'і («Пеpажані, Божа, хмаркі...»), аб тым, «каму сёлета жыта зажынаці», а таксама выказваецца спадзяванне на пачастунак за добрую працу на зажынках («Выпраўляюцца малажайкі на спраўленне зажынак», «Ой, цяпер у нас зажынкі»). У многіх Ж.п. знайшлі ўвасабленне сац. матывы антыпанскай, антыпрыгонніцкай накіраванасці («Да ў нашага пана да нядобрая слава»). У іх адбіліся анімістычныя звароты жняі да прыродных стыхій як да жывых істот (каб «ветрык паціхеньку» развеяў «хмарачку мнісеньку... маю тугу цяжаленьку, каб я малада жыты жала і сярэдзіну сваю не зажала...»). Гал. вобразы Ж.п. — жняя, месяц, поле, сонца, вячэрняя зара і інш. Яны дапамагаюць падкрэсліць эстэтычную значнасць нялёгкай працы жанчыны-жняі на ніве, надаюць ёй пры дапамозе маст. сродкаў пяшчотны характар («А што ў полі бялеецца?», «Чорна смародачка», «Лугавая перапёлка»). У Ж.п. знайшлі адлюстраванне складаныя сямейныя і грамадскія адносіны («Добры вечар! Халодная хатка, нялюдная матка», «Да пара дамоў, пара, мне маладой пары няма» і інш.). Многія песні характарызуюцца велічальнымі матывамі, перадаюць радасць з нагоды заканчэння вялікай цяжкай працы, якая прынясе дастатак роду, сям'і, забяспечыць усіх хлебам. Заканчэнне жніва ў песні часам параўноўваецца з вайной («У нас сягоння вайна была: // Мы ўсё поле зваявалі, // У снапочкі павязалі, // У копачкі паскладалі, // Свае ручкі патамілі, // Галовачкі засмуцілі...»). У наш час с.-г. машыны выключылі выкарыстанне традыц. прылад працы на полі, таму Ж.п. захоўваюцца пераважна ў памяці носьбітаў традыцыі. Далейшае існаванне Ж.п. у творчай практыцы магчыма ў разнастайных тыпах фалькларызму: традыц., другасным, апрацаваным, стылізаваным, рэстаўрыраваным, рэканструяваным.

*Літ.*: М о ж е й к о З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: опыт системно-типол. исслед. Минск, 1985; Л і с А.С. Жніўныя песні. Мінск, 1993.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЖО́ДЗІНА**, горад у Смалявіцкім р-не, на р. Пліса. За 55 км на ПнУ ад Мінска, чыг. станцыя на лініі Мінск—Орша, на аўтадарозе Мінск—Масква. 61,8 тыс. ж. (2011).

Упершыню згадваецца ў 1688 як в. Жодзіна Слабада ў Барысаўскім старостве Мінскіх павета і ваяв. ВКЛ, уласнасць Радзівілаў. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Барысаўскім павеце Мінскай губ. У 1863 адкрыта нар. вучылішча. У 1871 — чыг. станцыя на лініі Брэст—Масква. У 1886 сяло ў Смалявіцкай воласці, 48 двароў, 470 ж. У 1897 — 97 двароў, 697 ж., царква, нар. вучылішча, карчма, крама, млын, кузня. З 1919 у БССР. З 17.7.1924 вёска ў Смалявіцкім р-не, да 26.7.1930 Мінскай акругі. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета. У 1926 — 193 двары, 994 ж. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. У Вял. Айч.